# НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПАРК ДА СВЯТКАВАННЯ

# ВЯСНА БЕЛАВЕЖ



## Размова з генеральным дырэктарам Дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» Мікалаем Мікалаевічам Бамбізам

**— У час падрыхтоўкі да юбілею на тэрыторыі Нацыянальнага парку будуць узведзены новыя аб'екты. Якія з іх вы вызначыце як найбольш адметныя і важныя?**

— Адзін з галоўных новых аб'ектаў, на будаўніцтве якога засяродзім вялікую ўвагу, будзе экалагічна-асветны цэнтр. Мы пачалі яго праектаваць, ужо склалі заданне. У маі павінны пачацца работы. Гэта будзе комплекс, у склад якога ўвойдуць музей, бібліятэка, актавая зала, офіс для адміністрацыі. Будуць ужытыя, па прыкладзе замежным, самыя сучасныя тэхналогіі. Каб чалавек адчуў яго дзверы, увайшоў... і выйшаў адтуль з такім адчуваннем, што пабываў у лесе. Мы павінны дабіцца, каб чалавек часам хацеў пайсці не ў лес, а ў музей.

Ёсць пастанова Савета Міністраў і распараджэнне Прэзідэнта наконт падрыхтоўкі да святкавання 600-годдзя пушчы. Распрацавана праграма, вызначаны арганізацыі, якія адказныя за правядзенне мерапрыемстваў.

**— Ці будуць папаўняцца экспазіцыі для музея?**

— Так, яны папаўняюцца і цяпер, бо з кожным годам з'яўляюцца новыя. Летась, напрыклад, калі праводзіліся раскопкі, знайшлі стаянку старажытных людзей, якая была на тэрыторыі Белавежскай пушчы дзесяць тысяч гадоў таму. Археолагі знайшлі наканечнік стралы ў форме сэрца. Я бачыў — насамрэч, такім сапраўдным сардэчкам зроблены, амаль так, як цяпер уяўляем. Таму абавязкова ў музеі мы зробім раздзел археалогіі.

**— Якая сёння самая галоўная задача па развіцці інфраструктуры Белавежскай пушчы?**

— Будаўніцтва новых гасцініц, пунктаў харчавання, распрацоўка новых турыстычных маршрутаў, аднаўленне дарог. На тэрыторыі пушчы дзейнічае спрошчаны пераход праз мяжу, паток заходніх турыстаў з кожным годам толькі павялічваецца. Дарогі нашы не для таго, каб па іх машыны ездзілі, у нас запаведны рэжым, мы ствараем іх, каб наведвальнікі, па жаданні, маглі ездзіць на веласіпедах ці, напрыклад, лыжаролерах. Гэта будзе магчыма ў самым хуткім часе. Праграма па аднаўленні дарог у Белавежскай пушчы будзе завершана. Дарэчы, апошнім разам гэтым пытаннем займаліся яшчэ пры цары, у далёкім 1914 годзе.

**— Як распрацоўваюцца новыя турыстычныя маршруты?**

— З улікам асаблівасцяў гістарычных месцаў на тэрыторыі, правядзення даследчых работ. Вярнуся да тэмы раскопак — будзе адкрыты і археалагічны маршрут, каб людзі пабачылі, дзе жылі іх далёкія прашчуры і чаму яны выбралі месцам для паселішча Белавежскую пушчу.

**— А чаму, сапраўды, цікава?**

— Жылі яны тут таму, што спрадвеку пушча была багата на птушак і звяроў, давала людзям ежу, прытулак і абарону ад стыхіі.

**— Белавежская пушча — прывабнае месца для адпачынку. Для развіцця гэтага накірунку ўжо зроблена шмат, што яшчэ ў планах?**

— Павінна развівацца сістэма гасцініц і турыстычных паслуг не толькі ў самой Белавежскай пушчы, але і ў навакольных раёнах — Камянюкі, Пружаны... У іх радыусе будзе зроблена адпаведная зона, мы будзем ствараць яе па ўласнай методыцы, якая зараз адпрацоўваецца.

**— Як вы ўзаемадзейнічаеце з польскім бокам, на тэрыторыю якога таксама працягваецца пушча?**



— У нас няма канкурэнцыі, кожны мае ўласныя турыстычныя тэхналогіі. На сёння вядзецца ўзаемаабмен паміж бакамі. Мы робім усё, але, напрыклад, толькі год таму на польскім боку з'явіліся паказальныя знакі аб тым, што можна ажыццявіць пераход на беларускую тэрыторыю пушчы. Дагэтуль людзі, якія прыязджалі ў Польшчу ў Белавежскую пушчу, нават маглі і не ведаць, што яна працягваецца на дзве краіны.

**— Умовы працы ў Нацыянальным парку здавальняючыя. Кажуць, яны нават прыцягваюць спецыялістаў і з іншых абласцей?**

— Калі, напрыклад, Мінская вобласць знаходзіцца пасярэдзіне краіны, то яе магчымасці выбару спецыялістаў працягваюцца на 360 градусаў — уявіце круг, у сярэдзіне якога знаходзіцца Міншчына. Мы можам шукаць спецыялістаў, якія жывуць толькі ў межах «паловы круга» — у 180 градусаў, з усходніх абласцей. Зараз у Нацыянальным парку працуюць 1430 чалавек. Усе атрымліваюць даволі высокую заработную плату, сярэдні заробак у нас складае 700 тысяч рублёў. Гэта, я лічу, нармальна.

**— Дзе вы шукаеце «вузкіх» спецыялістаў для звярагаспадаркі, такіх як егеры, напрыклад? У Беларусі іх калі і рыхтуюць, то для патрэб такога волата, як Белавежская пушча, прафесіяналізм трэба адшліфоўваць гадамі...**

— Уменні гэтыя перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Увогуле, выпадковыя людзі надоўга ў нас не затрымліваюцца. Трэба любіць лес, прыроду, усё жывое навокал. Прозвішчы мясцовых людзей, якія працуюць у нас цяпер, напрыклад, Седун, прыгадваюцца яшчэ ў царскіх указах. Гэта былі родзічы сённяшніх нашых работнікаў. Я ўпэўнены, майстэрства егера, паляўнічага, чалавека, які даследуе звычкі і жыццё дзікіх звяроў, перадаецца амаль на генетычным узроўні і становіцца сямейным заняткам. Таму большасць такіх спецыялістаў — мясцовыя жыхары, якія ўсё жыццё аддалі пушчы, як і іх бацькі таксама.

**— З вышыні вашага вопыту, назіранняў, скажыце, калі ласка, на якой ступені свайго развіцця знаходзіцца Нацыянальны парк зараз? У якім стане яго багацці?**

— У любой краіне запаведныя, прыродаахоўныя зоны знаходзяцца пад юрысдыкцыяй і абаронай дзяржавы. У параўнанні з рэспублікамі былога Савецкага Саюза, я не буду крывіць душой, Беларусь утрымлівае Белавежскую пушчу на самым высокім узроўні, і гэта прызнаюць усе. Матэрыяльна-тэхнічная яе база, фінансаванне навуковых даследаванняў, распрацоўка ўсіх галіновых праграм вядзецца выключна «на выдатна».

**У наступным годзе, увосень, у той час, калі па ўсіх старажытных традыцыях было прынята весяліцца і радавацца, бо ўсе традыцыйныя вясенне-летнія клопаты скончыліся, не толькі наша краіна, але і ўся зацікаўленая сусветная грамадскасць будзе адзначаць вельмі прыемную дату. І, што незвычайна, звязана яна фактычна з усімі сферамі жыцця нашай, ды і не толькі, краіны. З яе гісторыяй і экалогіяй, культурай, мастацтвам і навукай, яе эканомікай, гаспадарчым ладам і турызмам, які ў апошнія часы ўсё больш і больш развіваецца. Налета Нацыянальны парк «Белавежская пушча» адзначыць шасцісотгоддзе з часу ўвядзення першых элементаў запаведнасці (альбо аховы). Упершыню азначэнне «Белавежская пушча» з'яўляецца ў літоўскіх і польскіх граматах у 1409 годзе.**

**Як ацаніць, шмат гэта ці не вельмі? Насамрэч, нямала. Разам з Беларуссю праз стагоддзі пушча пранесла розныя перыяды станаўлення і развіцця. Аднак заўсёды яна заставалася месцам асаблівым, незвычайным. Хто б ні гаспадарыў у ёй, разумеў, што зямля гэтая — запаветная і векапомная. І вельмі прыемна, што веліч і слава пушчы, найпрыгажэйшай мясціны нашай краіны, сёння ўзнята на самую высокую ступень. У 1992 годзе ўчастак высокаўзроставага лесу Нацыянальнага парку быў уключаны ў спіс Сусветнай Спадчыны Чалавецтва. У 1993-м Белавежскай пушчы быў дадзены міжнародны статус біясфернага запаведніка, праз чатыры гады Савет Еўропы ўзнагародзіў Нацыянальны парк Еўрапейскім дыпломам — яго прызналі эталонам прыродаахоўных устаноў. Летась Нацыянальны парк наведала 196 тысяч чалавек, прычым кожны дзесяты з іх з'яўляўся грамадзянінам замежнай дзяржавы. Вандруючы, турысты знаходзяць для сябе адметнае — малодшыя школьнікі, вядома ж, хочуць паглядзець на зубра, людзей сталага ўзросту прыцягвае паветра, подых якога больш не адчуеш больш нідзе. Цікаўныя да жывога, да прыроды маюць рэдкую магчымасць пабачыць унікальныя экзэмпляры раслін, ім прадастаўлена магчымасць сустрэць у натуральным асяроддзі рэдкіх жывёл.**

Сучасныя ўмовы патрабуюць ад Нацыянальнага парку вырашэння адразу ж некалькіх задач. Галоўная з іх — захаваць і памножыць уласнае нацыянальнае багацце. Аднак час на месцы не стаіць, пушча заўсёды лічылася турыстычнай зонай, месцам для правядзення навуковых даследаванняў, тэрыторыяй для вывучэння гісторыі, а з легендаў і паданняў пра яе можна скласці не адзін фальклорны стос.

Цяпер яна рыхтуецца да юбілею, і святкаванне 600-годдзя, так супала, прыйшлося якраз на чарговы этап яе развіцця — ужо вызначаны новыя планы і напрамкі, па якіх Нацыянальны парк будзе крочыць у будучыню. Два гады запар, у 2006-м і 2007-м, ён справядліва атрымліваў залаты медаль конкурсу «Брэнд года», у намінацыі «Спадчына». І каб даведацца, што менавіта вызначае любоў і цікавасць людзей да пушчы, чым яна вабіць і што можа прапанаваць замежным турыстам і закаханым у прыроду роднага краю людзям, што цікавага могуць знайсці для сябе навукоўцы, вандроўнікі, дзеці і дарослыя, карэспандэнты «Звязды» накіраваліся ў Белавежскую пушчу. Як аказалася, уяўленні нашы пра гэтыя мясціны былі далёка не поўнымі — каб больш-менш поўна пазнаёміцца з яе славутасцямі, выдатнымі мясцінамі, неабходна правесці тут не адзін дзень, а каб удосталь нацешыцца асалодай яе прыгажосці, трэба пражыць у пушчы ўсё жыццё.

### «Пушча — загадка, разгадка хаваецца ў лесе»

У новым асобным памяшканні экалагічна-асветнага цэнтра, які будзе пабудаваны, размесціцца, як адзначыў Мікалай Бамбіза, і музей, які будзе адпавядаць сусветным стандартам — там з'явяцца маніторы, на якіх можна будзе паглядзець вучэбныя фільмы, даведацца пра расліны, жывёл, пабачыць стужку-расказ пра тое, чым жыве пушча сёння. У такіх інфармацыйных электронных скрынях будуць знаходзіцца навушнікі-перакладчыкі — каб замежныя наведвальнікі пачулі інфармацыю на сваёй роднай мове. Таксама плануюць, што з'явіцца і музей пад адкрытым небам, які наглядна зможа расказаць пра ўсе часы жыцця чалавека ў пушчы. Часы старажытныя, з прыкладамі коп'яў і стрэлаў, і перыяду, калі людзі жылі ў курных хатах (іх ужо практычна не захавалася ў музеях краіны), і да сучаснасці. Сваё пачэснае месца атрымае і наканечнік стралы ў форме сэрца, знойдзены на леташніх раскопках.



Старшы навуковы супрацоўнік Ганна ДЗЯНГУБЕНКА.

Экспазіцыі дзеючага музея прыроды перамесціцца ў музей у будучым экацэнтры. Яны ўтрымліваюць усё, чым багаты жывёльны і раслінны свет пушчы. У музеі прадстаўлены калекцыі грыбоў, такія, што зайздросцяць усе мікалагі краіны, унікальныя калекцыі насякомых таксама з'яўляюцца вельмі цікавымі. Ну і, вядома ж, прадстаўлены ўвесь свет фаўны і флоры пушчы. І не толькі — музей можа ганарыцца ўласнай калекцыяй фотаздымкаў паляванняў расійскіх імператараў, яны даюць нам уяўленне, як на самай справе выконваўся паляўнічы рытуал, які называецца штрэка, — урачыстае мерапрыемства, пры якім кожны трафей абкладваўся вянком з дубовых лістоў, для кожнай з жывёл быў створаны ўласны гімн, а потым адбывалася дэманстрацыя ўсіх паляўнічых здабыткаў. «Да царскага палявання ў пушчы былі заўсёды дваякія адносіны. Кажуць, што вельмі шмат аленяў, казуль было пабіта за іх час. Аднак менавіта і дзякуючы паляванню пушча, хоць і высякалі яе актыўна стагоддзі таму, захавалася, таму што рускія і польскія каралі ўсё ж такі берaглі яе для сябе першапачаткова», — мяркуе дырэктар музея прыроды Людміла Грачанік.

Увогуле багацці пушчы вабілі да сябе аматараў хуткіх грошай — ужо з XVI стагоддзя тут пачаліся актыўныя высечкі лесу. У складзе Расійскай імперыі, пры Кацярыне II, Паўлу I шмат зямель было раздадзена, а праз гады яшчэ і замежныя лесапрамысловікі далучыліся да высечкі лясоў. У Першую сусветную вайну з пушчы вывезлі каля чатырох з паловай мільёнаў кубаметраў драўніны. Для гэтага пракладалі 300 кіламетраў вузкакалейкі. Нават захавалася да сённяшняга часу паляна, куды звозілі драўніну. Кара, якая ў вялікай колькасці асыпалася з дрэў, выдзеліла тады столькі рэчыва, што да сёння на гэтай паляне нічога не расце. Але з іншага боку, у перыяд Вялікай Айчыннай фашысты не чапалі яе, а наадварот — паставілі вакол вайсковую заслону і не дазвалялі нікому ні прайсці, ні праехаць. Таму што хацелі ператварыць тэрыторыю ў месца для адпачынку высокапастаўленых нямецкіх чыноў. Кажуць, што сам Герынг, які па запрашэнні польскага боку паляваў у 1939 годзе ў пушчы, звярнуў увагу на багацце белавежскіх лясоў, тым больш, што яго бацька быў галоўным лесаводам Германіі. І вырашыў не знішчаць дрэвы. Аднак не трэба думаць, што да навакольных людзей фашысты ставіліся з такой жа беражлівасцю. Хоць не было на тэрыторыі пушчы баявых дзеянняў, аднак у яе нетрах у 1990-х гадах знайшлі астанкі людзей — загубленых сялян, якія жылі ў час вайны ў бліжэйшых вёсках. Гісторыкі пачалі даследаванне, і быў знойдзены нават дзённік нямецкага афіцэра, які кіраваў расстрэлам. Між іншым, фашыст цынічна пісаў, што яго каты-салдаты трымаліся добра, ні ў кога не назіралася паслабленне страўніка... Цяпер у глыбіні лесу стаіць помнік жыхарам, на якім высечаны іх прозвішчы. «Падаючыя крыжы» — такая яго назва, нагадвае адначасова і гіганцкую свастыку, і праваслаўны крыж — у памяць аб жорсткасці і смутку аб загінулых.







Дуб-патрыярх



Гісторыя пушчы тоіць у сабе яшчэ шмат загадак, і каб разгадаць іх, яшчэ патрэбен час. Ёсць і навуковыя — напрыклад, гістарычныя архівы яе яшчэ не сістэматызаваныя, але ёсць і тыя, аб якіх яшчэ будзе разважаць не адно пакаленне. Не толькі спецыялістаў. Напрыклад, у глыбіні яе захаваўся на камені след нагі... Багародзіцы. Вернікі кажуць, што Божая маці ішла па свеце, і на месцы, дзе зараз Белавежская пушча шуміць, ёй у абутак парушынка трапіла. Яна спынілася, каб зняць яго, і з гэтага часу на камені след застаўся — абутай і босай нагі. Да яго прыходзяць маліцца, збіраюць ваду з гэтага месца, каб абмыць ёю твар.

Як месца з доўгай, яшчэ да канца не разгаданай таямніцай, захоўвае лес яшчэ адзін старажытны артэфакт — камень з паглыбленнем накшталт чашы, куды нашыя продкі прыносілі дары паганскім багам. Недалёка стаіць і дуб са скразным дуплом, якім раней... лячылі людзей. Было такое павер'е — хвораму трэба было наноў нарадзіцца, і гэта лічылася магчымым, калі ён праходзіў скрозь ствол дрэва. Хто прыносіў ахвяры, якое племя? Ці лячыла гэтае дрэва? У гэтым яшчэ трэба разабрацца. Дарэчы, турысты, якіх вабіць чароўнасць даўніны, таксама могуць паспрабаваць знайсці адказ на гэтыя пытанні.

«Асобныя навуковыя звесткі аб раслінным і жывёльным свеце Белавежскай пушчы вядомыя яшчэ з XVI—XVII стагоддзяў. Захаваліся асобныя запісы паслоў, якія наведвалі яе. Зрэдку тагачасныя натуралісты вычэрчвалі карты, адзначалі, якія віды раслін ёсць. Да рэвалюцыі планавых даследаванняў не існавала, увагу вучоных прыцягвалі асобныя падзеі, напрыклад, такія, як нашэсце шкоднага шаўкапрада-манашанкі, колькасць і ўмовы існавання зуброў і іншых жывёл, наяўнасць высокаўзроставых дрэў і т.п. Тады пачыналіся распрацоўкі — як змагацца з гэтай з'явай, як утрымліваць пушчу, як абыходзіцца з зубрам. Больш планава даследаванні разгарнуліся, калі пушча перайшла да палякаў, ды і ў свеце навука тады ўжо развівалася на больш высокім узроўні. У 1939 годзе, калі тэрыторыя пушчы далучылася да БССР, быў створаны навуковы аддзел, з пачатку 1944 года ён аднавіў сваю дзейнасць. Сёлета спаўняецца ўжо паўстагоддзя з таго часу, як быў выдадзены першы зборнік «Белавежская пушча», — кажа вядучы навуковы супрацоўнік, кандыдат біялагічных навук Ганна Дзянгубенка.

І па сёння момант распрацоўкі, навуковыя даследаванні, сумесна і з Акадэміяй навук, і са студэнтамі-гісторыкамі, і ўласным штатам навукоўцаў, працягваецца. Тое, што ў пушчы яшчэ шмат чаго не даследавана — перакананы ўсе.

### «Безліч у пушчах і звера, і птушкі Пушча сваёю красой захапляе»

Не ўсе ведаюць, але менавіта дзякуючы намаганням, ініцыятыве Мікалая Бамбізы, у 2006 годзе да Белавежскай пушчы былі далучаны землі Камянецкага, Пружанскага, Свіслацкага раёнаў. Частка іх лясных масіваў такім чынам набыла статус Нацыянальнага парку, і агульная яго плошча павялічылася на вельмі добры кавалак. Бо пушча, якая б вялікая яна ні была, на геаграфічнай карце толькі кропка сярод прамысловых мегаполісаў. І таму ўсё роўна адчувае ўздзеянне цывілізацыі. Далучаныя землі, якія з цягам часу ператворацца ў густыя лясы, будуць ахоўваюць асноўную, галоўную частку пушчы ад магчымых наступстваў чалавечай дзейнасці, быць бар'ерам для гэтых запаведных месцаў. Зараз агульная плошча пушчы складае 163 505 гектараў, а працягласць яе з поўначы на поўдзень больш за 60 кіламетраў, з захаду на ўсход — ад дзесяці да пяцідзесяці.

У Белавежскай пушчы жыве адно з самых маленькіх сысуноў у свеце — буразубка малая, яна важыць каля 4 грамаў. Пушчу насяляе, вядома ж, і зубр — самая вялікая жывёліна Еўропы на сушы і адно з самых вялікіх у свеце стварэнняў прыроды. У 1939 годзе налічвалася 52 зубры ў заапарках, а на волі — ніводнага. Удалося тады сабраць дзесьці пяць галоў і перасяліць іх у пушчу. Прадзед беларускіх зуброў, чучала якога стаіць на ўваходзе ў музей, — Пугенал, адзін з першых, якога прывезлі сюды. Яго родзічамі былі зубры каўказскай лініі, і ўвогуле, усе белавежскія зубры цяпер — паміж сабой сваякі. У «Песні пра зубра» сцвярджаецца, што паміж рагамі старажытнага зубра маглі ўсесціся тры чалавекі, аднак вучоныя лічаць, што ўсё ж такі гэта быў тур. Ці людзі былі не такія вялікія, як цяпер. Спрэчка, дарэчы, не сціхае па сёння. Цяпер у Белавежскай пушчы жыве дастатковая колькасць легендарных жывёл. Іх можна сустрэць і на пешых маршрутах для турыстаў у глыб пушчы. Зубр жыве нават... на дрэве. Ёсць на адным з дрэў у лесе нараст, які зрабіла прырода. Каля самай дарогі расце яно, і яшчэ здалёк бачнае, — сапраўды, нібыта маленькі зубр абляпіў ствол. Раней, у 1860 годзе, па загаду Аляксандра II у пушчы быў пастаўлены помнік зубру, пасля аднаго з удачных паляванняў 6—7 кастрычніка. На яго былі запрошаны аўстрыйскія і прускія прынцы. У гонар заканчэння



Сімвал пушчы жыве і на бярозе.





Пушча ў квецені.



Цэнтралізаванае тэсціраванне-2008

# ПАСАДАЧНАЕ МЕСЦА АБІТУРЫЕНТУ БУДУЦЬ ШУКАЦЬ У ПУНКЦЕ РЭГІСТРАЦЫІ

**2 мая ў Беларусі распачнецца рэгістрацыя ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Рэгістрацыя на цэнтралізаванае тэсціраванне — гэта толькі першы, але вельмі адказны этап для маладых людзей, якія збіраюцца гэтым летам «штурмаваць» вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Галоўнае, што свой прафесійны выбар абітурыентам прыйдзецца ажыццявіць ужо цяпер, бо ад яго напрамую будзе залежаць і пералік вучэбных дысцыплін, на якія трэба будзе зарэгістравацца. Варта нагадаць, што прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне можна не больш чым па трох дысцыплінах.**

Рэгістрацыя будзе весціся з 2 мая па 1 чэрвеня ўключна, акрамя 4, 5, 6, 9, 10, 11 і 18 мая.

— Усе нашы пункты рэгістрацыі будуць працаваць з 8 гадзін раніцы і да 20 гадзін, — патлумачыў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай Фяськоў. — Для таго, каб не ствараць ажыятаж і вялізныя чэргі ў пунктах рэгістрацыі, я параіў бы абітурыентам не бегчы рэгістравацца ўсім у першы дзень, але і не адкладваць гэту важную справу на апошні момант. Хачу звярнуць увагу абітурыентаў на тую акалічнасць, што ў нядзелю 25 мая і 1 чэрвеня рэгістрацыя ўдзельнікаў ЦТ таксама будзе весціся. З мэтай рацыянальнага выкарыстання аўдыторнага фонду я рэкамендую абітурыентам рэгістравацца на ўсе дысцыпліны ў адным пункце рэгістрацыі — бліжэй да іх месца жыхарства ці да месца цяперашняй вучобы. Падкрэслю, што маладым людзям, якія плануюць паступаць у сталічныя навучальныя ўстановы, зусім неабавязкова ехаць здаваць цэнтралізаванае тэсціраванне ў Мінск. Паверце, што месца праходжання тэсціравання ніяк не звязана з будучым выбарам навучальнай установы. Тэсты для абітурыентаў ВНУ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў абсалютна раўназначныя па складанасці і ўсе ўдзельнікі атрымліваюць аднолькавыя сертыфікаты без указання месца праходжання тэсціравання.

Мікалай Фяськоў таксама паведаміў, што пляцовак, на базе якіх будзе праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне, асабліва ў сталіцы, значна больш, чым пунктаў рэгістрацыі. Гэта робіцца для зручнасці абітурыентаў. Пасадачнае месца ім будуць шукаць у пункце рэгістрацыі, і яно будзе ўказана ў пропуску на ЦТ. Да таго ж так арганізатарам тэсціравання значна прасцей раўнамерна размяркоўваць удзельнікаў тэсціравання па навучальных установах. Пільнасць абітурыентам таксама зусім не пашкодзіць: майце на ўвазе, што пропуск лічыцца зарэгістраваным, калі на ім маецца пячатка ўстановы, вызначанай пунктам правядзення тэсціравання, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар. У выпадку страты пропуска абітурыенту выдаецца дублікат.

Зарэгістравацца на цэнтралізаванае тэсціраванне можна не толькі па пашпарце грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, але і па пасведчанні на права жыхарства, а таксама па пасведчанні бежанца. Да таго ж для рэгістрацыі спатрэбіцца і дакумент аб унясенні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні (10 тысяч рублёў за кожны прадмет) ці дакумент, які пацвярджае права на вызваленне ад устаноўленай платы.

Згодна з пастановай урада ад унясення платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ вызваляюцца:

— дзеці-сіроты, дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, асобы з кола дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў, асобы з анкалагічнымі захворваннямі і хворыя на туберкулёз;

— інваліды I і II груп;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых або з сем'яў рабочых і служачых, якія займалі штатныя пасады ў вайсковых часцях у складзе савецкіх войскаў, асобаў начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, якія загінулі (памерлі) ці сталі інвалідамі пры выкананні воінскага ці службовага абавязку (службовых абавязкаў) у Афганістане ці ў іншых дзяржавах, дзе вяліся баявыя дзеянні, а таксама памерлі ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворванняў, атрыманых у перыяд баявых дзеянняў;

— дзеці з сем'яў ваеннаслужачых, асобаў начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, органаў фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржаўнага кантролю, якія загінулі ці сталі інвалідамі пры выкананні абавязкаў воінскай службы (службовых абавязкаў), а таксама памерлі ці сталі інвалідамі ў перыяд воінскай службы ў выніку ранення, кантузіі, калецтва ці захворвання, непасрэдна звязаных са спецыфікай нясення воінскай службы (службы);

— дзеці з сем'яў, у якіх выхоўваюцца трое і больш непаўналетніх дзяцей.

Замежным грамадзянам неабавязкова асабіста прыязджаць у Беларусь, каб атрымаць пропуск на цэнтралізаванае тэсціраванне. За іх гэта могуць зрабіць, напрыклад, сваякі. Яны могуць самастойна ўнесці плату за прыём і афармленне дакументаў, падаць заяву ад імя абітурыента і зарэгістраваць яго для ўдзелу ў тэсціраванні на падставе ксеракопіі дакумента, які сведчыць асобу будучага ўдзельніка ЦТ. Натарыяльна ксеракопію можна не завяраць. Але прайсці цэнтралізаванае тэсціраванне можна будзе толькі маючы на руках арыгінальны дакумент, па ксеракопіі якога ажыццяўлялася рэгістрацыя. Можна таксама адправіць заяву для ўдзелу ў ЦТ і копію дакумента, які сведчыць асобу, па пошце, а дакумент аб унясенні платы за прыём і афармленне дакументаў для ўдзелу ў ЦТ і дакумент, які сведчыць асобу абітурыента (яго арыгінал) прад'явіць пры атрыманні пропуску. Бланк заявы можна знайсці на сайце Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў www.rikz.unibel.by.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Графік правядзення ЦТ на 2008 год

Згодна з пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь цэнтралізаванае тэсціраванне ў 2008 годзе будзе праводзіцца паводле наступнага графіка:

Беларуская мова — 12 чэрвеня, чацвер.
Руская мова — 13 чэрвеня, пятніца.
Гісторыя Беларусі — 15 чэрвеня, нядзеля.
Сусветная гісторыя навейшага часу — 17 чэрвеня, аўторак.
Матэматыка — 19 чэрвеня, чацвер.
«Чалавек. Грамадства. Дзяржава» — 21 чэрвеня, субота.
Геаграфія — 22 чэрвеня, нядзеля.
Фізіка — 23 чэрвеня, панядзелак.
Біялогія — 25 чэрвеня, серада.
Замежныя мовы — 27 чэрвеня, пятніца.
Хімія — 28 чэрвеня, субота.

Для абітурыентаў , якія па ўважлівай прычыне не змаглі ўзяць удзел у цэнтралізаваным тэсціраванні ў асноўны дзень, вызначаны рэзервовы дзень — 2 ліпеня 2008 года.

Рэгістрацыя абітурыентаў для ўдзелу ў ЦТ будзе праводзіцца ў перыяд з 2 мая па 1 чэрвеня 2008 года.

Час пачатку цэнтралізаванага тэсціравання — 11.00.

Пыталіся? Адказваем...

## На ЦТ па матэматыцы будзе 30 заданняў

***— Патлумачце, калі ласка, хто з выпускнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў мае права паступаць у ВНУ на скарочаныя тэрміны навучання? Што маецца на ўвазе пад «адпаведнымі спецыяльнасцямі»?***

— Згодна з дзеючымі Правіламі прыёму ў ВНУ, на скарочаны тэрмін навучання ў межах кантрольных лічбаў ажыццяўляецца прыём абітурыентаў, якія атрымалі сярэднюю спецыяльную адукацыю па вучэбных праграмах, узгодненых з вучэбнымі праграмамі адпаведных спецыяльнасцяў ВНУ.

На сёння падрыхтоўка спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй ажыццяўляецца ў Беларусі па 360 спецыяльнасцях, а з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй — па 150 спецыяльнасцях, уключаных у Агульнадзяржаўны класіфікатар Рэспублікі Беларусь «Спецыяльнасці і кваліфікацыі». Значыць, паняцце «адпаведныя спецыяльнасці» ўключае як спецыяльнасці, якія супадаюць па назве, так і роднасныя спецыяльнасці. Галоўнай умовай набору абітурыентаў для атрымання вышэйшай адукацыі ў скарочаныя тэрміны з'яўляецца адпаведнасць вучэбнай праграмы спецыяльнасці сярэдняй спецыяльнай адукацыі праграме спецыяльнасці вышэйшай адукацыі. Вызначэнне пераліку спецыяльнасцяў сярэдняй спецыяльнай адукацыі адпаведным спецыяльнасцям вышэйшай адукацыі знаходзіцца ў кампетэнцыі прыёмнай камісіі ВНУ. У кампетэнцыі прыёмнай камісіі знаходзіцца таксама і пытанне залічэння на другі і наступны курсы абітурыентаў, якія паступаюць для атрымання другой вышэйшай адукацыі. Калі прыёмная камісія вызначае, што абітурыент можа быць залічаны на другі ці больш старшы курс, то ён не здае ўступныя іспыты разам з асноўнай масай абітурыентаў, а калі на першы курс — то яму давядзецца здаваць разам з усімі цэнтралізаванае тэсціраванне.

***— Ці праўда, што колькасць заданняў у тэстах на ЦТ па матэматыцы і фізіцы ў гэтым годзе зменіцца?***

— У Рэспубліканскім інстытуце кантролю ведаў пацвердзілі, што сёлета было прынята рашэнне ўніфікаваць і колькасць заданняў, і час, адведзены на выкананне тэстаў па матэматыцы і фізіцы. Такім чынам, і на матэматыцы, і на фізіцы ўдзельнікам тэсціравання будуць прапанаваныя 30 задач, з якімі трэба будзе справіцца за 180 хвілін.

***— Мая ўнучка вучыцца ў дзесятым класе і хоча прысвяціць сябе пасля заканчэння школы рабоце, звязанай з лесам і прыродай. Падкажыце, калі ласка, у якіх навучальных установах гэта можна зрабіць і якая адукацыя патрабуецца: базавая ці сярэдняя?***

— У Міністэрстве лясной гаспадаркі нам паведамілі, што спецыялістаў для лясной галіны рыхтуюць як у сярэдніх спецыяльных, так і ў прафесійна-тэхнічных навучальных установах. У прыватнасці, спецыяльнасць «лясная гаспадарка» ёсць у Полацкім дзяржаўным лясным тэхнікуме, Барысаўскім экалагічным прафесійным ліцэі, у Магілёўскім прафесійным агралесатэхнічным каледжы (як на аснове базавай, так і на аснове агульнай сярэдняй адукацыі), у Свірскім сельскагаспадарчым прафесійным ліцэі, Рэчыцкім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 178, Пінскім дзяржаўным ПТВ № 161 (на аснове агульнай сярэдняй адукацыі), а таксама ў Буда-Кашалёўскім аграрна-тэхнічным каледжы, Прыборскім сельскагаспадарчым ПТВ № 185, Слаўгарадскім прафесійным ліцэі № 3 і Відзаўскім дзяржаўным прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 169.

Акрамя таго, спецыяльнасць «лясная гаспадарка» ёсць і ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце. На спецыяльнасці «лясная гаспадарка» прадугледжаны спецыялізацыі «лесазнаўства і лесаводства», «лесапаляўнічая гаспадарка і пабочнае карыстанне лесам», «ахова лесу», «інфармацыйныя сістэмы ў лясной гаспадарцы» і «лясная сертыфікацыя». Але для дзяўчат, напэўна, больш пасуе спецыяльнасць «садова-паркавае будаўніцтва». Выпускнікі гэтай спецыяльнасці могуць працаваць інжынерам садова-паркавай гаспадаркі, аграномам па ахове раслін, начальнікам лесагадавальніка, майстрам зялёнай гаспадаркі, інжынерам па лесанасеннай гаспадарцы ці, напрыклад, інжынерам па лесасыравінных рэсурсах.

***— Дапамажыце даведацца аб правілах прыёму на гуманітарны факультэт БДУ на спецыяльнасць «сацыяльная работа» (спецыялізацыя «медыка-сацыяльная дапамога насельніцтву»). Мяне цікавіць, дзе могуць быць запатрабаваныя спецыялісты гэтага профілю.***

У Белдзяржуніверсітэце спецыяльнасць «сацыяльная работа» (накірунак «сацыя-медыка-псіхалагічная дзейнасць») ёсць як на гуманітарным факультэце, так і ў Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ. Пры паступленні на гэту спецыяльнасць абітурыенты здаюць на цэнтралізаваным тэсціраванні біялогію, гісторыю Беларусі і тэсціраванне па адной з дзвюх дзяржаўных моў. Дакументы на дзённую і завочную формы навучання прымаюцца з 12 па 23 ліпеня.

Сацыяльная работа — адносна новая, але перспектыўная спецыяльнасць. Спецыялісты па сацыяльнай рабоце запатрабаваныя ў вырашэнні сацыяльна-псіхалагічных праблем, якія тычацца захавання фізічнага і псіхічнага здароўя, пераадолення наступстваў захворванняў і траўмаў, што прыводзяць да інваліднасці. Адначасова з усебаковай агульнагуманітарнай падрыхтоўкай студэнты атрымліваюць веды па псіхалогіі, асновам псіхатэрапіі, узроставай псіхалогіі, псіхалагічнай карэкцыі, сацыяльнай геранталогіі, сацыяльнай медыцыне, сацыяльнай экалогіі, тэорыі і практыцы сацыяльнай работы, канфліктalогіі, медыка-сацыяльных асновах здароўя, рэабілітaлогіі і г.д. А ўвядзенне ў вучэбны план шэрагу прававых дысцыплін і менеджменту дазваляе выпускнікам працаваць не толькі ў рамках дзяржаўных структур (сацыяльная абарона, ахова здароўя, сфера адукацыі) і грамадскіх арганізацый (міжнародныя і рэспубліканскія асацыяцыі і таварыствы), але і развіваць самастойна бізнэс у сферы сацыяльных паслуг.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Ветэрынарна-санітарныя ўрачы — у вострым дэфіцыце

**Прыём на дзве новыя спецыяльнасці «ветэрынарная санітарыя і экспертыза» і «ветэрынарная фармацыя» будзе весціся ў гэтым годзе ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.**

— За шматгадовую гісторыю (а ў наступным годзе мы адзначым ужо свой 85-гадовы юбілей) у акадэміі было падрыхтавана больш як 30 тысяч урачоў ветэрынарнай медыцыны і 10 тысяч зоаінжынераў. А вось падрыхтоўка ветэрынарна-санітарных урачоў у Беларусі да апошняга часу наладжана не была, — падзяліўся сваімі думкамі ў гутарцы з намі **рэктар акадэміі, доктар ветэрынарных навук, прафесар Антон ЯТУСЕВІЧ.** — Хоць запатрабаванасць такіх спецыялістаў на беларускіх прадпрыемствах вельмі высокая. І ў далейшым іх рэйтынг на рынку працы будзе толькі расці, паколькі патрабаванні да бяспечнасці прадуктаў харчавання становяцца ўсё больш жорсткімі ва ўсім свеце, і наша краіна — таксама не выключэнне. Да таго ж трэба думаць і аб тым, як ахоўваць тэрыторыю Беларусі ад завозу ці заносу розных заразных захворванняў.

Месцам працы будучых ветэрынарна-санітарных урачоў стануць прадпрыемствы перапрацоўчай прамысловасці, лабараторыі дзяржаўнай ветэрынарнай санітарнай экспертызы на рынках, аб'екты ветэрынарнага нагляду на мяжы і на транспарце, навукова-даследчыя ўстановы і г.д.

Яшчэ адна наша новая спецыяльнасць — «ветэрынарная фармацыя», пасля заканчэння якой выпускніку будзе прысвойвацца кваліфікацыя фармацэўта ветэрынарнай медыцыны. Студэнтам гэтай спецыяльнасці давядзецца асвойваць многія віды прафесійнай дзейнасці: вытворчую (работа ў аптэках, на фармацэўтычных фабрыках і хіміка-фармацэўтычнай вытворчасці), кантрольную (вызначэнне якасці лекавых сродкаў і біяпрэпаратаў, метадаў нарыхтоўкі і захоўвання лекавай сыравіны) і агульную фармацэўтычную (работа ў ветэрынарных аптэках, на станцыях па барацьбе з захворваннямі жывёлы і г.д).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ПУНКТЫ РЭГІСТРАЦЫІ ДЛЯ ЎДЗЕЛУ Ў ЦЭНТРАЛІЗАВАНЫМ ТЭСЦІРАВАННІ 2008 г.

### г. Мінск

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адукацыйныя прадметы | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|---|
| **1** | **Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт** | 220013, г. Мінск, вул. Якуба Коласа, 12, корпус 8 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bntu.by** |
| 2 | Вышэйшы дзяржаўны каледж сувязі | | | www.vks.belpak.by |
| 3 | Ваенная акадэмія Рэспублікі Беларусь | | | |
| 4 | Мінскі дзяржаўны гандлёвы каледж | | | www.mqtk.by |
| **5** | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт** | 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД, геаграфія | **www.bsu.by** |
| 6 | Філіял «Індустрыяльна-педагагічны каледж» Установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі» | | | www.ipk.ripo.unibel.by |
| 7 | Міжнародны інстытут працоўных і сацыяльных адносінаў | | | www.mitso.by |
| 8 | Інстытут парламентарызму і прадпрымальніцтва | | | www.ipp.by |
| **9** | **Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт** | 220070, г. Мінск, Партызанскі пр., 26, вучэбны корпус 3 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bseu.by** |
| 10 | Мінскі інстытут кіравання | | | www.miu.by |
| 11 | Мінскі дзяржаўны аўтамабільны каледж | | | www.mqak.ripo.unibel.by |
| 12 | Інстытут прадпрымальніцкай дзейнасці | | | www.uoipd.org |
| **13** | **Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт** | 220023, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 99, корпус 2 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.batu.edu.by** |
| 14 | Мінскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | | www.mqpk.unibel.by |
| 15 | Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава | | | www.isz.minsk.by |
| **16** | **Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі** | 220013, г. Мінск, вул. П. Броўкі, 4, корпус 2 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.abitur.bsuir.by** |
| 17 | Мінскі дзяржаўны вышэйшы радыётэхнічны каледж | | | www.mgvrk.by |
| 18 | Міжнародны гуманітарна-эканамічны інстытут | | | www.mgei.org |
| **19** | **Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка** | 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, 18 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, французская мова, іспанская мова, нямецкая мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.bspu.unibel.by** |
| 20 | БІП — інстытут правазнаўства | | | www.bip-ip.info |
| 21 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры | | | www.sportedu.by |
| 22 | Беларускі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | | | www.bstu.unibel.by |
| **23** | **Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт** | 220034, г. Мінск, вул. Захарава, 21 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.mslu.by** |
| 24 | Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь | | | www.academy.mia.by |
| 25 | Прыватны інстытут кіравання і прадпрымальніцтва | | | www.imb.by |
| **26** | **Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт** | 220116, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 83, корпус 1 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД, сусветная гісторыя | **www.pk.bsmu.by** |
| 27 | Акадэмія кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь | | | www.pacademy.edu.by |
| 28 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў | | | www.buk.by |
| **29** | **Міжнародны дзяржаўны экалагічны ўніверсітэт імя А.Дз. Сахарава** | 220009, г. Мінск, вул. Далгабродская, 23 | руская мова, беларуская мова, матэматыка, фізіка, біялогія, хімія, англійская мова, гісторыя Беларусі, ЧГД | **www.iseu.by** |
| 30 | Мінскі дзяржаўны вышэйшы авіяцыйны каледж | | | www.mgvak.by |
| 31 | Камандна-інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь | | | www.kii.gov.by |
| 32 | Жаночы інстытут «ЭНВІЛА» | | | www.envila.by |

### Брэсцкая вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | **Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт** | 224017, г. Брэст, вул. Маскоўская, 267, корпус 2, галерэя | www.bstu.by |
| 2 | Брэсцкі дзяржаўны політэхнічны каледж | | bgpk.iatp.by |
| 3 | Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна | 224016, г. Брэст, бульвар Касманаўтаў, 21 | www.brsu.brest.by |
| 4 | Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт | 225409, Брэсцкая вобласць, г. Баранавічы, вул. Камсамольская, 84 | www.barsu.by |
| 5 | Баранавіцкі тэхналагічны каледж Белкаапсаюза | | www.barsu.by |
| 6 | Палескі дзяржаўны ўніверсітэт | 225710, г. Пінск, вул. Кірава, 24 | www.psunbrb.by |
| 7 | Пінскі дзяржаўны індустрыяльна-педагагічны каледж | 225710, г. Пінск, вул. Іркуцка-Пінскай дывізіі, 27 | www.pqipk.by |

### Віцебская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт | 210035, г. Віцебск, Маскоўскі пр., 72 | www.vstu.vitebsk.by |
| 2 | Віцебскі дзяржаўны ордэна Дружбы народаў медыцынскі ўніверсітэт | 210023, г. Віцебск, пр. Фрунзэ, 27 | www.vgmu.vitebsk.by |
| 3 | Віцебскі дзяржаўны тэхнічны каледж | 210033, г. Віцебск, вул. Лазо, 113 а | www.vgtk.vitebsk.by |
| 4 | Віцебская ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны | 210026, г. Віцебск, вул. Даватара, 3-б | www.vsavm.com |
| 5 | Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава | 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр., 33 | www.vsu.by |
| 6 | Аршанскі дзяржаўны механіка-эканамічны каледж | 211382, г. Орша, вул. Савецкая, 81 | www.osmec.narod.ru |
| 7 | Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт | 211440, г. Наваполацк, вул. Блахіна, 29 | www.psu.by |
| 8 | Наваполацкі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум | 211440, г. Наваполацк, вул. Ктатарава, 22 | www.ngpt2004.narod.ru |

### Гомельская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Гомельскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя П.О. Сухога | 246746, г. Гомель, пр. Кастрычніка, 48 | www.gstu.gomel.by |
| 2 | Гомельскі дзяржаўны машынабудаўнічы тэхнікум | 246027, г. Гомель, вул. Аб'язная, 2 | www.uo.ggmt.org |
| 3 | Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны | 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 102, корпус 5 | www.gsu.unibel.by/testing |
| 4 | Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт транспарту | 246653, г. Гомель, вул. Кірава, 34 | www.belsut.gomel.by |
| 5 | Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна | 247760, г. Мазыр, вул. Студэнцкая, 28, корпус 1 | www.mgpu.gomel.by |
| 6 | Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | 246000, г. Гомель, вул. Ланге, 5, корпус 1 | www.meduniver.gomel.by |
| 7 | Гомельскі інжынерны інстытут Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь | 246023, г. Гомель, Рэчыцкае шасэ, 35 а | www.gii.gomel.by |
| 8 | Мазырскі дзяржаўны політэхнічны тэхнікум | 247760, г. Мазыр, вул. Катлаўца, 23 | www.mgpt.gomel.by |
| 9 | Светлагорскі дзяржаўны індустрыяльны тэхнікум | 247434, Гомельская вобласць, г. Светлагорск, вул. Шасэйная, 10 | www.sgit.gomel.by |
| 10 | Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі | 246029, г. Гомель, праспект Кастрычніка, 50 | www.bteu.by |

### Гродзенская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | **Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы** | 230023, г. Гродна, вул. Кастрычніцкая, 5 | www.grsu.by/ctest |
| 2 | Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт | | |
| 3 | Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт | | |
| 4 | Гродзенскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | - |
| 5 | Лідскі тэхнічны каледж УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» | 231300, Гродзенская вобласць, г. Ліда, вул. Савецкая, 18 | www.grsu.by |
| 6 | Ваўкавыскі дзяржаўны аграрны каледж | 231900, Гродзенская вобласць, г. Ваўкавыск, вул. Перамогі, 52 | - |

### Мінская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | Барысаўскі дзяржаўны політэхнічны каледж | 222120, г. Барысаў, вул. Гагарына, 68 | www.bgpk.of.by |
| 2 | Маладзечанскі дзяржаўны політэхнічны каледж | 222310, г. Маладзечна, Цэнтральная плошча, 2, корп. 1 | mgpk.molodechno.by |
| 3 | Салігорскі дзяржаўны горна-хімічны тэхнікум | 223710, Мінская вобласць, г. Салігорск, вул. Казлова, 18 | www.sgght.belhost.by |

### Магілёўская вобласць

| № п/п | Назва пункта тэсціравання | Адрас пункта рэгістрацыі | Адрас Web-сайта |
|---|---|---|---|
| 1 | **Беларуска-Расійскі ўніверсітэт** | 212005, г. Магілёў, пр. Міру, 43 | www.rct.bru.mogilev.by |
| 2 | Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова | | www.msu.mogilev.by |
| 3 | Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт харчавання | | www.mgup.mogilev.by www.bru.mogilev.by/rct |
| 4 | Магілёўскі дзяржаўны політэхнічны каледж | | www.politex.mogilev.by |
| 5 | Беларуская дзяржаўная ордэна Кастрычніцкай Рэвалюцыі і Працоўнага Чырвонага Сцяга сельскагаспадарчая акадэмія | 213410, г. Горкі, Магілёўская вобл., БДСГА, вул. Мічурына, 13 | www.baa.by |
| 6 | Клімавіцкі дзяржаўны аграрны каледж | 213634, г. Клімавічы, вул. Леніна, 11 | - |
| 7 | Бабруйскі дзяржаўны аўтатранспартны каледж | 213826, г. Бабруйск, вул. Пушкіна, 145 | www.autokollege.narod.ru |
| 8 | Бабруйскі філіял УА «Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт» | | www.bfbgeu.by |

# «ГАНАРОВЫ АБАВЯЗАК»... ЗА ЖАЛЕЗНЫМІ КРАТАМІ

***Маскоўскі раённы ваенны камісарыят горада Мінска сумесна з судом Маскоўскага раёна правёў выязное пасяджэнне суда. Разглядалі справы грамадзян, якія ўхіляюцца ад мерапрыемстваў прызыву на ваенную службу. На чужых памылках разам з прызыўнікамі вучылася і карэспандэнт «ЧЗ».***

...

**Усе мы з нецярпеннем чакаем лета, сонца, адпачынку. Толькі нехта паедзе загараць на мора, а нехта прасядзіць лепшыя летнія месяцы ў «каменным мяшку» за кратамі...**

«Служба ва Ўзброеных Сілах Рэспублікі Беларусь з'яўляецца ганаровым абавязкам кожнага грамадзяніна», — кінуўся ў вочы надпіс, які вісеў побач з гімнам над дзвярыма. Павінен з'яўляцца, — пранеслася думка, — але адным здароўе не дазваляе яго выканаць, іншыя ж праўдай і няпраўдай спрабуюць ухіліцца ад святога абавязку. Безумоўна, не кожны малады чалавек прызыўнога ўзросту пойдзе служыць у армію, але, тым не менш, каб пазбегнуць праблем, усе як адзін павінны ў абавязковым парадку прайсці медыцынскую камісію.

Дваццацітрохгадовы Дзмітрый Г. стварыў сабе праблему сваімі ж рукамі. Малады чалавек наўмысна ўхіліўся ад мерапрыемства прызыву на ваенную службу: ні 4, ні 8 студзеня 2008 года ён не з'явіўся на медкамісію без уважлівых на тое прычын (уважлівымі прычынамі лічацца: хвароба, выклік у іншыя праваахоўныя органы, надзвычайная сітуацыя, смерць блізкіх родзічаў ці перашкода стыхійнага характару, пацверджаныя адпаведнымі дакументамі).

Больш за тое, так ён зрабіў не ўпершыню. Паводле слоў пракурора **Маскоўскага раёна горада Мінска Віктара ЖЫНГЕЛЯ,** два гады таму за ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на хлопца наклалі адміністрацыйную адказнасць. І на гэты раз да апошняга моманту Дзіма быў упэўнены, што абыдзецца штрафам.

— Я не думаў, што наступствы будуць настолькі сур'ёзнымі, што справа дойдзе да суда, — гаворыць абвінавачваны. — Павестку атрымаў, але ўважліва не прачытаў. 4 студзеня быў за горадам. Так як зламалася машына, я не змог прайсці медагляд. А 8-га прыехаў у паліклініку, паглядзеў, што чарга вялікая і паехаў дадому. Не ведаю чаму.

— Прызнаяце сваю віну поўнасцю? — звяртаецца да абвінавачванага суддзя.

— Так.

— Раскайваецеся?

— Так.

— Не бачна. Камісію нават да гэтага часу не прайшлі?

— Прайду.

— Віна даказана поўнасцю. Прашу прызначыць меру пакарання ў выглядзе 6 месяцаў арышту, — вынес свой вердыкт пракурор.

Суддзя дала Дзмітрыю апошняе слова.

— Давайце я лепш штраф заплачу, не арыштоўвайце.

— Чым плаціць будзеце, вы ж нідзе не працуеце?

— Машыну прадам... Я ж не адмаўляюся служыць у арміі, проста дыплом хачу атрымаць (хлопец вучыцца ў Інстытуце парламентарызму і прадпрымальніцтва, куды аднавіўся пасля адлічэння).

— А вы ведаеце, што грамадзяне, якіх адлічылі за акадэмічную непаспяховасць ці недысцыплінаванасць, трацяць права на паўторную адтэрміноўку для прадаўжэння адукацыі?

— Так.

...

**Суд вынес рашэнне: пазбаўленне волі на 4 месяцы.**

...

— Не паўтарайце памылак гэтага хлопца, — звярнуўся пракурор да прызыўнікоў. — Лепш ідзіце ў армію служыць, чым сядзець на лаве падсудных, а пасля ў турме. Тым больш, што арышт не вызваляе ад службы ў арміі. Адсядзіць хлопец чатыры месяцы — і зноў атрымае павестку ў ваенкамат. Таму артыкул Крымінальнага кодэкса і называецца не ўхіленне ад прызыву, а ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву на ваенную службу.

...

Другі абвінавачваны не з'явіўся. Спрабавалі звязацца па мабільным — адключаны, патэлефанавалі на хатні нумар — трубку падняў бацька, які сказаў, што Вася паўгадзіны таму з'ехаў з дому і дзе знаходзіцца сын зараз, ён не ведае. Суд прыняў рашэнне знайсці хлопца і да чарговага судовага пасяджэння ўзяць пад варту.

...

Летні прызыў пачаўся з 1 красавіка. У другой палове ліпеня маладыя хлопцы папоўняць армейскія шэрагі... Некаторыя з іх трапяць на лавы падсудных. Хочацца, каб апошніх было як мага менш.

**Каментарый начальніка аддзялення прызыву на ваенную службу Маскоўскага раённага ваеннага камісарыята горада Мінска, падпалкоўніка Андрэя КАРАСЕВА:**

— Толькі за чатыры месяцы гэтага года ваенкаматам Маскоўскага раёна было перададзена 54 справы ў пракуратуру Маскоўскага раёна. На 48 чалавек узбуджана крымінальная справа, 24 з іх ужо атрымалі самыя розныя пакаранні: пачынаючы ад штрафу да арышту тэрмінам на шэсць месяцаў. Да адміністрацыйнай жа адказнасці мы прыцягнулі 124 прызыўнікі (на іх былі наложаны штрафы за няяўку ў ваенкамат).

Ад прызыву вызвалены грамадзяне, якія не маюць бацькоў ці чые родныя сталі інвалідамі ў перыяд праходжання вайсковай службы (гэта невялікая па колькасці катэгорыя грамадзян), грамадзяне, якія былі прыцягнуты да крымінальнай адказнасці (акрамя спраў, заведзеных за ўхіленне ад мерапрыемстваў прызыву), па стане здароўя. Штогод толькі Маскоўскі раён перадае на ўлік ваеннаабавязаных каля 500 прызыўнікоў, прызнаных непрыдатнымі да ваеннай службы.

Колькасць «ухіляльнікаў» змяншаецца ў сувязі з тым, што расшырана колькасць адтэрміновак.

Адтэрміноўкі прадастаўляюцца па сямейных абставінах (калі жонка цяжарная), для прадаўжэння адукацыі, у сувязі з дэпутацкай дзейнасцю... Асноўны від адтэрміноўкі — для прадаўжэння адукацыі. Яна прадумана зараз законам настолькі, што маладыя людзі, якія імкнуцца да ведаў, могуць пасля таго, як сталі на ўлік, у ваенкамат больш і не трапіць (у 18 гадоў заканчвае школу, у 21 — тэхнікум, у 26—27 — інстытут) .

Акрамя таго, цяпер для выпускнікоў заканадаўствам прадугледжана адтэрміноўка ад прызыву ва Ўзброеныя Сілы да 1 верасня. Таму малады чалавек можа не бегаць па ваенкаматах у «гарачы час», а спакойна здаваць тэсты і паступаць у ВНУ. У выпадку паспяховай здачы ўступных іспытаў, прызыўнік можа атрымаць чарговую адтэрміноўку на перыяд навучання.

Для тых, хто скончыў універсітэт, таксама маюцца льготы: служба ў рэзерве (грамадзяне з вышэйшай адукацыяй служаць на працягу двух гадоў, але ў войсках яны бываюць толькі на зборах каля трох месяцаў). Усё гэта зроблена для таго, каб акрэсленая катэгорыя спецыялістаў прыносіла як мага больш карысці на грамадзянцы.



Суд выносіць Дзмітрыю Г. пакаранне ў выглядзе 4 месяцаў арышту.

**Надзея ДРЫЛА,**
**фота аўтара.**

Анатомія кахання

## ЖАНЧЫНА ВЫБІРАЕ МУЖЧЫНУ ПА ПАХУ

Як вядома, «мужчына кахае вачамі, а жанчына вушамі». Праведзеныя навуковыя даследаванні ўнеслі ў гэтае сцвярджэнне невялікае ўдакладненне: прадстаўнікі супрацьлеглых полаў «чуюць» адно аднаго па паху.

Улоўліванне полавых пахаў ажыццяўляецца асаблівым механізмам. Ён знаходзіцца бліжэй да кончыка носа, на перагародцы, і называецца вомераназальным органам («вомерам»). Ферамоны, ці полавыя пахі, ёсць у кожнага, але дзейнічаюць яны не напрамую і ўспрымаюцца намі інакш, чым звычайныя. Да таго ж, усе ўлоўліваюць іх па рознаму.

У залежнасці ад таго, як развіты вомер у чалавека, у значнай ступені вызначаюцца яго сэксуальныя магчымасці. Індывідуальны пах мужчыны і жанчыны залежыць ад многіх прычын. У асноўным ён звязаны з асаблівасцю гарманальнай сістэмы, а таксама біяэнергетычным полем. Гэты пах унікальны, як адпячаткі пальцаў, і ў многім вызначае прывабнасць таго ці іншага чалавека.

Калі мужчына ўступае ў зносіны з жанчынай, то паступаючыя сігналы — ферамоны пераўтвараюцца яго галаўным мозгам і прыводзяць да змянення біяхімічных працэсаў у арганізме. Пры гэтым колькасць тэстастэрону ў крыві павялічваецца, што надае рашучасці і падштурхоўвае да актыўных дзеянняў. Арганізм жанчыны, у сваю чаргу, атрымаўшы адпаведны сігнал у выглядзе паху, адказвае павелічэннем гармону эстрагену, і жанчына становіцца ўспрымальнай да заляцанняў гэтага мужчыны. Такім чынам, на пачатковай стадыі зносінаў прадстаўнікі абодвух полаў як бы «вынюхваюць» адно аднаго, прычым лідарства ў слабай паловы чалавецтва, бо ў жанчын больш развіты нюх.

# ПАЧЫНАЕ ПАДРЫХТОЎКУ 600-ГОДДЗЯ
# КСКАЙ ПУШЧЫ


Будуецца новы чатырохзоркавы гатэль.

царскай забавы быў адліты зубр у натуральную велічыню, і паставілі яго на гранітны пастамент. Цяпер гэты помнік знаходзіцца ў Польшчы, але вось пастамента з шыльдай, якая тлумачыць паходжанне зубра, на жаль, не захавалася

Белавежская пушча па колькасці відаў жывёльнага і раслiннага свету прызнана адным з найбагацейшых месцаў на планеце, тут з'яўляецца ўсё больш новых прадстаўнікоў флоры і фаўны. Напрыклад, была заўважана самая што ні на ёсць сапраўдная архідэя, кветка якой мела пах ванілі. Расце і плюшч, які ў нашай краіне сустракаецца (і тое кропкава) толькі ў раёне Мар'інай Горкі. У пушчы пачалі гнездавацца знікаючыя віды птушак — арлан-белахвост і белая чапля. Птушкі пасяліліся ў пушчы дзякуючы ў тым ліку і стварэнню тут штучных азёраў. Яны ўзводзіліся з 1960-х гадоў. Запаведна-паляўнічая гаспадарка, якая працавала тады ў пушчы, мела патрэбу ў развядзенні дзікіх вадаплаўных птушак. Для гэтай мэты і пачалі праводзіць меліярацыю, стварылі вадасховішчы. Яны станоўча паўплывалі на павелічэнне разнастайнасці арнітафаўны. Напрыклад, арлан-белахвост, які харчуецца рыбай з вадаёмаў, можа жыць толькі ў месцах, дзе не адчуваецца прамысловага ўздзеяння чалавека на навакольнае асяроддзе. Хімікаты і адходы, іншыя забруджвальнікі трапляюць у ваду, адтуль у арганізм рыбы. У страўнік арлана, які спажывае рыбу, і могуць трапіць шкодныя рэчывы, якія потым назапашваюцца ў арганізме птушкі. Зразумела, нічога добрага яны ёй не прыносяць. Таму арлан-белахвост можа жыць толькі ў экалагічна чыстых мясцінах. Азёраў у пушчы некалькі дзесяткаў, на некаторых абсталяваны пляжы для адпачываючых.

Адно з самых старых дрэў у пушчы — дуб, якому каля 600 гадоў. Да яго любяць хадзіць людзі. Цяпер велікан ужо рэдка прыносіць жалуды. Але, як сцвярджае паданне, той, хто яго знойдзе, і пасадзіць у зямлю, можа загадваць любое жаданне — яно абавязкова збудзецца. Яго вышыня — 28 метраў, дыяметр — два (каб яго абхапіць, патрэбна пяць чалавек). Яго драўніны хапіла б, каб пабудаваць невялікі дом. Аднак, безумоўна, знішчаць такое дрэва і ў галаву нікому не прыйдзе. Хоць былі спробы — на яго кары выразна відаць след ад цыркулярнай пілы. Яго пакінулі англійскія лесарубы з фірмы «Century European Corporation», ці, як называлі яе мясцовыя жыхары, «Цэнтурыя». Пасля заканчэння Першай сусветнай вайны, згода з Рыжскім пагадненнем, частка пушчы перайшла да палякаў. Яны і аддалі вялікую частку яе плошчы пад канцэсію лесапрамыслоўцаў-»цэнтурыянцаў». Аднак нават іх магутным пілам не пакарыўся асілак. Яны не здолелі зваліць яго, толькі паспрабавалі падпілаваць. Некалькі гадоў таму ўраган зламаў тры галіны дуба — з іх атрымалася амаль дзве машыны дроў. Увогуле, дуб у пушчы — адно са знакавых дрэў. Ёсць яшчэ адзін, таксама знакаміты — удзельнік першых кінафільмаў пра Белавежскую пушчу. У сярэдзіне яго прырода зрабіла адтуліну, у якую майстры ўладкавалі статую дзядулі-лесавічка. Кажуць, дзядуля вельмі мудры, ён ведае мову птушак і звяроў, а асабліва любіць ён дапамагаць закаханым. Калі падысці і ціхенька расказаць яму пра каханага чалавек, то ўжо не разлучышся з ім ніколі.

Яшчэ адно векапомнае дрэва — сасна, вышынёй у 30 метраў, і ўзростам больш за 350 гадоў. Не так даўно вучоныя праводзілі даследаванне і высветлілі, што ў насенні «маладых» хвойных дрэў на 30 працэнтаў карыснага геннага матэрыялу менш, чым у «старых» елак і соснаў. Сярэдні ўзрост дрэў пушчы — 100 гадоў. Сярод дрэў, характэрных для гэтых мясцін, расце яшчэ ясень, ліпа, асіна, бяроза, граб, вяз. Дарэчы, апошні жыве толькі на вельмі ўрадлівых глебах. Нават з'явілася здагадка, што назва «Брэст» пайшла не ад слова «бяроста», як меркавалі раней, а ад азначэння «бераст» (пасучаснаму — вяз). У пушчы можна сустрэць і рэдкія дрэвы — у прыватнасці, піхта белая, алешына, якая расце адным ствалом, а не як мы прывыклі бачыць, парасняком.

«Пушча ніколі не надакучыць, то ельнік, то вясёлы бярэзнік, магутныя дубы стаяць... Такая пастаянная мазаічнасць характэрна для натуральных лясоў, якія растуць у адпаведнасці з экалагічнымі патрэбамі кожнай драўлянай пароды», — тлумачыць Ганна Дзянгубенка.

На жаль, уздзеянне навакольнага асяроддзя ўплывае на стан лясоў. І не толькі ў Белавежскай пушчы, такая з'ява назіраецца ва ўсім свеце. Нацыянальны парк выконвае і ролю «вартаўніка» Еўропы на шляху тэхналагічна забруджанага паветра. Таму актуальна пытанне захавання ляснога багацця, адна з галоўных задач работнікаў — дапамагчы характэрным для пушчы раслінам і дрэвам. Для гэтага запланавана спецыяльна вырошчваць добры пасадачны матэрыял для аднаўлення лясных дрэвастанаў, падтрымкі колькаснай і відавой разнастайнасці

## «Пушча напоена, нетры яе і прылескі — месцы ігрышчаў»



У часы Савецкага Саюза пушчу наведвалі каля 200 тысяч турыстаў у год. У пачатку 1990-х гадоў паток знізіўся да 15 тысяч чалавек. Цяпер цікавасць людзей да гэтага месца аднаўлена — толькі за чатыры сёлетніх месяцы сюды завітала ўжо 50 тысяч турыстаў. Кола гасцей, якія б хацелі не толькі даведацца пра цуд Беларусі, але і на ўласныя вочы яго пабачыць, пашыраецца. І гэта заканамерна, бо турыстам з кожным годам прапануецца ўсё больш паслуг, пастаянна распрацоўваюцца ўсё новыя і новыя метады прыцягнення. Улічваюць усе дробязі. Да шасцісотгоддзя нават Інтэрнэт-сайт www.npbp.brest.by хуткім часам зменіць свой выгляд і склад.

— Цяпер сайт створаны на рускай мове. З-за гэтага за мяжой недастатковая колькасць людзей, якая можа прыехаць да нас, можа скарыстацца інфармацыяй, размешчанай на яго электронных старонках. Таму з мэтай больш шырокага прыцягнення замежнай публікі ўсіх узростаў, мы вырашылі змяніць сайт, і ўжо хутка ён будзе даступны і на англійскай мове. Увогуле, уся інфармацыя будзе дапоўнена, дабаўлена шмат новых матэрыялаў. Сайт будзе складацца з навінаў, інфармацыі аб Белавежскай пушчы, навуковых даследаваннях у ёй, актыўна будзе працаваць раздзел турызму. Увагу звернем і на старонку, прысвечаную беларускаму Дзеду Марозу... Змяніцца і знешні выгляд — створым новы дызайн Інтэрнэт-старонак, — распавядае вядучы спецыяліст па інфармацыі Людміла Куземка.


Лясная фея, захавальніца сядзібы Дзеда Мароза Марыя БЯДОК.

Дарэчы, пра Дзеда Мароза... Калі раней у пушчу прыязджалі для таго, каб захапіцца зубрамі, паблукаць па цудоўным лесе, паглядзець на музейныя экспанаты, і проста насыціцца свежым паветрам, якога ў горадзе больш няма, то цяпер пушча стала вядомай яшчэ і як месца пражывання навагодняга цудадзея — Дзеда Мароза. Завітаць у яго сядзібу прыязджаюць не тое што палякі, украінцы, немцы, і, вядома ж, беларусы, але і расіяне — а ў іх дзядуля гэты жыве нават у двух месцах, у Вялікім Усцюгу і маскоўскіх Кузьмінках. Летась 75 тысяч чалавек пажадалі прыехаць у госці да белавежскага Дзеда Мароза і яго ўнучкі Снягуркі. Прычым не толькі дзеці, але і дарослыя з нецярпеннем чакаюць, калі прыедуць сюды яшчэ раз — бо кожны год тут з'яўляецца ўсё больш новага і цікавага.

І зразумела чаму. Ужо каля варот у сядзібу вас сустрэнуць два драўляныя вартаўнікі, зробленыя мастаком і рэзчыкам па дрэве Аляксандрам Масло — ён сваімі рукамі аздобіў ці не ўсё гэтае месца. Вартаўнікі, кажуць, прапускаюць толькі людзей з добрымі думкамі, бо злым і дрэнным асобам у Дзеда Мароза рабіць няма чаго. Захавальніца сядзібы Марыя Бядок расказвае паданні і казкі чароўнай сядзібы. Іх, аказваецца, столькі, што, здаецца, не хопіць і ўсяго дня, каб праслухаць.


Палац Дзеда Мароза.

«У мінулым годзе ў сядзібе пачалося перабудаванне. Памянялі ілюмінацыю — толькі ў доме, дзе жыве Дзед Мароз, з'явілася каля 40 тысяч агеньчыкаў. Пабудаваны на новым месцы Млын, які перамолвае дрэнныя людскія ўчынкі, ператварае іх у пыл і пясок, каб зла на зямлі стала менш. Калі дакрануцца да яго рукой і так пастаяць некалькі хвілін, жаданні абавязкова спраўдзяцца. Аднавілі палянку, на якой стаяць казачныя Дванаццаць месяцаў. У халодную, марозную пару года, на свята Масленіцы ў яе сярэдзіне раскладваецца вялізнае вогнішча, і каля яго могуць грэцца ўсе ахвотнікі.

Існуе старажытная гісторыя, што навагодняя ёлка, самае высокае дрэва ў краіне, пасадзіў Дзед Мароз з адзінага зярнятка. Ён палiваў і прыглядваў за ёй, калі раптам наляцеў злы вецер Сухавей і так моцна дзьмуў, што нават старыя дубы паваліліся. Але ёлачка выстаяла, расце ў сядзібе на радасць людзям, і цяпер кожны год каля яе весяляцца людзі. Калі паглядзець у вокны дома Снягуркі, можна ўбачыць у люстэрку на процілеглым баку сваё адлюстраванне. Мужчыны пасля гэтага стануць больш мужнымі, а жанчыны — яшчэ прыгажэйшымі. Ёсць у нас і яшчэ адно люстэрка — менавіта тое, якое разбіла мачаха ў казцы пра Спячую прыгажуню. Яго аскепкі трапілі ў Белавежскую пушчу, імі абкладзены калодзеж Дзеда Мароза. Калі да яго наблізіцца чалавек, які не зрабіў ніводнага злога ўчынку за ўсё жыццё, чароўнае люстэрка зноў стане цэлым».


З Брэсцкай вобласці прыехала ў пушчу першакласніца Альбіна МАРЦЬЯНАВА.

Шчыра кажучы, захапляльная прагулка па ўзгорках сядзібы, дзе на кожным кроку цябе сустракаюць казачныя персанажы, героі, пра якіх маці чытала гісторыі ў дзяцінстве, нават дарослых людзей пераконвае ў тым, што цуд існуе, і што з Дзедам Марозам можна сустрэцца і цяпер. Хоць і прайшло свята Новага года, але ён усё роўна жыве ў сваім доме, і чакае кожнага дарослага і дзіця, сустракае сваіх гасцей не ў зімовай футры, а ў летнім уборы. Вось толькі яго Снягурка паехала пагасціць да бабулі Зімы. Але вернецца з надыходам халадоў.

З пачаткам кожнага новага турыстычнага сезона традыцыйна Белавежская пушча прапануе сваім гасцям усё больш паслуг. Хутка адчыніць свае дзверы новая гасцініца, якая будавалася з разлікам на атрыманне статуса чатырохзоркавай. У ёй будзе більярдная зала і саўна, басейн, месцы для адпачынку, рэстаран. Аднак, акрамя яе, і цяпер кожны госць можа знайсці сабе занятак для больш цікавага адпачынку. Можна пайсці на чатыры—шэсць гадзін на рыбалку, працуе цудоўная спартыўная зала, саўна, тэнісны корт. Аматары актыўнага баўлення часу могуць узяць на пракат веласіпед, а хутка — і ролікавыя канькі, выбрацца на шматгадзінны пешы маршрут у глыб пушчы, дзе ёсць усе шанцы ў жывой прыродзе сустрэць аленя, дзіка, зубра... Дзікіх звяроў — зуброў, аленяў, тарпанаў — можна ўбачыць і ў вялікіх вальерах. Іх можна таксама ўбачыць, калі ажыццявіць на вясёлым «цягнічку» падарожжа па Нацыянальным парку.

Калі прагаладаліся — на выбар рэстаран ці некалькі кафэ. Дарэчы, у рэстаране Белавежскай пушчы нават знакамітая галівудская актрыса Джэйн Фонда і не менш вядомы медыямагнат Тэд Цёрнер з апетытам каштавалі стравы паляўнічай кухні. Бо гэта адно з нямногіх месцаў у краіне, дзе гатуюцца спрадвечна беларускія стравы з дзічыны, цудадзейныя напоі, настоеныя на пушчанскіх травах.


У адным з залаў рэстарана.

Новая гасцініца будзе ўжо чацвёртай па ліку, тут ужо працуюць дзве, і яшчэ адна — у бліжэйшай вёсцы Камянюкі. Прычым яны маюць статус трохзоркавых, у іх вельмі ўтульныя, з усімі выгодамі, паўлюксавыя і люксавыя нумары, якія разлічаны на аднаго, два чалавекі, ці сям'ю. Высокі ўзровень сэрвісу ў іх ніяк не ўплывае на кошт — ён, відавочна, невысокі. У параўнанні з гасцініцамі такога ж узроўню ў іншых месцах нашай краіны (ужо не будзем казаць пра замежжа), Белавежская пушча прапануе сваім гасцям рэальна даступны кошт адпачынку. Напрыклад, паўлюксавы нумар на аднаго чалавека каштуе 56 тысяч, у цану ўваходзіць і сняданак. Не дзіва, што нумары запоўнены круглы год. А яшчэ акрамя іх на тэрыторыі лясніцтваў, якіх у Нацыянальным парку шаснаццаць, адпачываючым прапануюць і гасцявыя домікі. Яны знаходзяцца ў самім лесе, што, згадзіцеся, для людзей, якія прыехалі адмыслова паблукаць па пушчы, адчуць гоман яе дрэў, вельмі зручна. Кампанія з дзевяці-дванаццаці чалавек можа нават размясціцца ў былым маёнтку графа Тышкевіча. Дом яго цяпер вядомы як,гістарычнае месца і карыстаецца папулярнасцю. Дарэчы, стаіць ён на поўначы пушчы, у запаведнай зоне, якая ўключана ў Спіс сусветнай спадчыны чалавецтва.

Тое, што аб высокім узроўні сэрвісу тут клапоцяцца пастаянна, улічваюць кожную дробязь, бачна нават па тым, як утрымліваюцца дарогі. Яны сваімі артэрыямі аб'ядноўваюць Белавежскую пушчу. Калі раней, каб дабрацца з паўночных лясніцтваў да адміністрацыйнага цэнтра ў вёсцы Камянюкі, трэба было ехаць некалькі дзён, то цяпер гэты прамежак пераадольваецца за тры-чатыры гадзіны. Былі аднoўлены ўнікальныя чыгунныя масты, што стаяць на дарогах пушчы. Яны былі пабудаваны больш за стагоддзе таму расійскім імператарам — усяго іх дзесяць на беларускай, і два на польскай тэрыторыі. Раней, пры цару, на мастах былі замацаваны барэльефы з выявай двухгаловага арла з вензелем цара. Потым у XX стагоддзі гербы імперыі былі з мастоў знятыя. І толькі некалькі гадоў таму па ініцыятыве Мікалая Бамбізы выявы былі па-новаму адліты і замацаваны на ранейшых месцах. Масты, такім чынам, набылі свой першапачатковы выгляд. Увогуле, гісторыя стварэння пушчанскіх дарог можа даць інфармацыі не менш, чым экскурсаводы. Некаторыя былі перароблены з вузкакалейкі — таго самага чыгуначнага шляху, з якога немцы ў першую сусветную вывозілі драўніну. Адну з першых за ўсю гісторыю мясцовыя жыхары ўмоўна называюць «28 паваротаў». Яна выводзіць турыстаў да вялікай паляны, дзе раней у польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага былі смалакурні. Цяпер на гэтым месцы праводзяцца святы і ўрачыстасці, умацавана невялікая сцэна, пабудаваны месцы для адпачынку. Па гумарыстычных расказах мясцовых жыхароў, дарогу праклалі адмыслова перад прыездам караля Панятоўскага ў пушчу. Яго высокасць вырашыў праверыць, як працуюць яго гаспадаркі. Дык вось, нанялі спецыяльнага майстра, які рабіў сваю справу не тое што дрэнна — але марудліва. А тут ужо вестка разнеслася, маўляў, Панятоўскі выехаў. Пачалі хуценька да смалакурняў прачышчаць шлях, і выйшла дарога крывая, з паваротамі, каляінамі і калдобінамі. Прыехаў, нарэшце, кароль, і адразу ж майстра да сябе падзывае. А той падыходзіць і думае — усё, не даруюць яму за такую дрэнную дарогу. З жыццём развітаўся. А ў карэце, па баках караля, між іншым вялікага ахвотніка да паненак, сядзяць дзве дзяўчыны прыгажосці неапісальнай. Ехалі яны з Панятоўскім увесь час, і як паварот трапляў, дык то адна, то другая да яго высокасці прыхіліцца, а як каляіна — дык увогуле і на яго калені, да радасці караля, скачуць. І кажа Станіслаў Аўгуст майстру, што той малайчына, добрую дарогу зрабіў. Толькі адзін недахоп. «Павароты?» — з жахам пытаецца майстра. «Так, — адказвае кароль, пазіраючы на паненак. — Павароты. Мог бы ўжо і больш іх зрабіць»...


Дырэктар музея Людміла ГРАЧАНІК.

...На сёння для карысці, развіцця дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Белавежская пушча» зроблена шмат. І, як адзначае Мікалай Бамбіза, работа працягваецца, вызначаныя прыярытэтныя задачы выконваюцца. Захаванне і аднаўленне прыродных багаццяў пушчы, навуковыя распрацоўкі і даследаванні, развіццё турыстычнай інфраструктуры — гэта толькі асноўныя напрамкі, па якіх працуюць людзі. Усім нам Белавежская пушча яшчэ з дзяцінства ўяўлялася запаветным, векапомным, магутным, у нечым казачным месцам. Такая яна на самай справе і ёсць — прыгожая і бясконца мудрая, нібыта сама маці-прырода сваёй рукой пяшчотна, з любоўю падарыла нам сваё стварэнне. Падарыла не толькі для захаплення, але і для таго, каб людзі вучыліся любіць і берагаць усё жывое, каб мы адчувалі, што вось гэтае месца і ёсць родны край. Рыхтуючыся да свайго 600-годдзя, Нацыянальны парк уступае ў яшчэ больш высокую стадыю свайго развіцця і станаўлення. Зараз стала магчыма зрабіць тое, аб чым толькі марылі яшчэ дваццаць гадоў таму. І таму можна з упэўненасцю казаць, што гісторыя Белавежскай пушчы толькі пачынае свой новы адлік.


На такім аўто катаюцца турысты.


Адзін з царскіх мастоў




Дзіўная рэч — плюшч на белавежскай бярозе.

**Дзмітрый АЛЬФЕР,**
**Алена ДАЎЖАНОК,**
**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).**

*Дзяржаўная прыродаахоўная ўстанова «Нацыянальны парк «Белавежская пушча»*
*Ліцэнзія нумар 02310/0278232 на права турыстычнай дзейнасці, выдадзена Міністэрствам спорту і турызму на падставе рашэння ад 22 верасня 2005 года № 734 тэрмінам на 5 гадоў да 22 верасня 2010 года. УНП: 200056212*

